# [Што азначаюць пытаньні „адкуль яно?“ і „дзеля чаго яно?“]

Аднаго разу Лора пытала: „Адкуль бяруцца мышы?“ На адказ: „Родзяцца ад мышы“ яна зноў запытала: „А адкуль тая, што родзіць?“ Лоры 6 гадоў.

Падставаю для такога пытаньня было зьяўленьне мышэй у пакоі. І пытаньне, адкуль бяруцца мышы, азначала ўласна — адкуль яны тут, дзе ня было іх.

Пытаньне **„адкуль яно“** азначае зьяўленьне ў крузе суб’екта такога, што на яго так ці іначай дзейнічае і над чым гэты суб’ект хоча ўзяць уладу і падпарадкаваць яго сабе. У гэтым яго падстава. „Адкуль яно“, т[акім] ч[ынам], азначае „адкуль яно тут“.

Калі гаворыцца **„яно“**, дык гэта зазначае, што „нешта“ з нічога для „я“ стала „нечым“, стала „яно“ для „я“ або, каб льга было так сказаць, дык гэта можна было–б выразіць як „яінае яно“. Т[акім] ч[ынам], „яно“ — гэта быцьцё, пэўная яго форма ў дачыненьнях да суб’екта.

---

Што азначаюць пытаньні: „адкуль яно?“ і „дзеля чаго яно?“ Яны азначаюць імкненьне таго, хто ставіць перад сабою гэтыя пытаньні, пазнаць пачатак як прычыну данага і канец як мэту яго. Ін[акш] к[ажучы], у яго імкненьне ведаць зьяву ў яе ўзьнікненьні, быцьці і зьнікненьні, г. зн. як–бы ў трох яе станах *(або ў трох відах яе быцьця?)* або ў яе жыцьцёвым крузе. (Пытаньні гэтыя датычаць **зьяў**.) Яны азначаюць імкненьне пазнаць сэнс таго, што існуе зьне таго, хто пытае. Ці не азначае гэта, што ён шукае сэнсу свайго ўласнага існаван[ьня] ў сабе, шукаючы яго зьне сябе для іншага? Яны азначаюць імкненьне пазнаць істасьць узьнікненьня, існасьць пачатку, каб самім быць гэтакім–жа пачаткам, каб самім умець даваць пачатак ад зьяваў, каб самім, т[ак] ск[азаць], раджаць новае. А калі гэта так, дык такога роду пытаньні ўзьнікаюць там, дзе брак гэтага ўменьня пачатку, дзе брак прычыны, дзе ня ўмеюць быць прычынаю, быць пачаткам. Пытаньне–ж „дзеля чаго?“ — там, дзе баяцца канца, што азначае патрэбу новага пачатку, якім ня ўмеюць быць пытальшчыкі. Яно там, дзе ў наяве самы гэты канец.

Як кожная зьява ў прыродзе ёсьць адначасна і пачатак новай зьявы, і канец старой, ёсьць адначасна і прычына аднаго, і пасьледак другога, так і чалавек ня ёсьць выключэньне з гэтага закону. Ён таксама і пачатак і канец, і прычына і пасьледак. Ён заключае ў сабе і пачатак, і канец іншага. І ці не азначае ў такім разе пытаньне „адкуль яно?“ пытаньня: які пачатак я нашу ў сабе, ін[акш] кажучы, ці не шуканьне гэта азначэньня самога сябе, ці не шуканьне гэта самога сябе як свайго іншага?

*[Восень — зіма 1931]*